# УПЛЫЎ ІДЭЙ Я. КУПАЛЫ І Я. КОЛАСА НА ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ НАПАЧАТКУ XX СТ.

**Духаменка Вераніка Валер'еўна**

студэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларусь, г. Мінск

**Лянцэвіч Вольга Міхайлаўна**

научный руководитель, навуковы кіраўнік Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларусь, г. Мінск

# ВЛИЯНИЕ ИДЕЙ Я. КУПАЛЫ И Я.КОЛАСА НА ФОРМИРОВАНИЕ БЕЛОРУССКОЙ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИДЕИ В НАЧАЛЕ XX ВЕКА

***Духоменко Вероника Валерьевна***

*студент, Белорусский государственный университет, Беларусь, г. Минск*

***Ленцевич Ольга Михайловна***

*научный руководитель, канд. ист. наук, доцент, Белорусский государственный университет, Беларусь, г. Минск*

2022 год у гісторыі беларускай літаратуры быў важкім на юбілейныя даты: улетку і восенню краіна адзначала 140-ыя ўгодкі з дня нараджэння адразу двух класікаў, чыя творчасць напачатку XX ст. стала не толькі новым словам у маладой беларускай літаратуры, але і ўзняла найважнейшыя праблемы грамадска-палітычнага жыцця краіны, – Янкі Купалы (1882 – 1942) і Якуба Коласа (1882 – 1956).

Дарэвалюцыйная творчасць Коласа і Купалы напоўнена смуткам аб цяжкім лёсе працоўнага сялянства, рэвалюцыйным пратэстам супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту беларускага народа, марай аб яго свабодным жыцці. Аўтары былі выразнікамі ідэі развіцця беларускай нацыянальнай самасвядомасці, народных пачуццяў. Яны шырока раскрывалі нацыянальны характар, асаблівасці духоўнага складу і матэрыяльнага жыцця беларусаў. Важнай акалічнасцю, якая аб’ядноўвае працы паэтаў, з’яўляецца агульны падыход да разгляду чалавечай асобы як галоўнай самакаштоўнай сілы, якая рухае гісторыю, неаддзельнай ад сукупнасці яе фізічных і духоўных праяў [1, с. 130].

Я. Колас побач з Я. Купалам «… сцвердзілі сваю, новую школу ў развіцці нацыянальнай літаратуры. Разам з празаікамі-рэалістамі М. Гарэцкім і К. Чорным, яны сталі здабыткам ужо агульнага працэсу, страцілі прыкметы індывідуальнага стылю і набылі якасці тыпалагічна вызначальных прынцыпаў. І для сучаснікаў, і для наступных пакаленняў яны сталі тым жыццядайным пачаткам, які ў значнай ступені паўплываў на змест і структуру іх твораў» [2, с. 544]. Стоячы ля вытокаў нацыянальнай рэалістычнай прозы, кожны з аўтараў зрабіў унёсак у скарбонку развіцця філасафічнасці беларускай прозы: Я. Колас – шляхам раскрыцця

чалавека праз яго ўчынкі ў непарыўнай сувязі з грамадствам, побытам і прыродай; Я. Купала – праз раскрыццё індывідуальнай свядомасці і яе ўзаемаадносін з грамадствам, а таксама праз паказ народнай свядомасці, лёсу народа, повязі часоў.

Паэты клікалі народ да барацьбы з прыгнятальнікамі. Янка Купала ў сваім вершы «Водклік з 29 кастрычніка 1905 г. у Мінску», напісаным з нагоды расстрэлу 18 кастрычніка на Прывакзальнай плошчы Мінска па загаду губернатара Паўла Курлова 20-тысячнага мірнага мітынга працоўных, якія выступілі супраць царскага маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 г., піша:

Божа наш, Божа, што гэта будзе,

Што гэтак сталі таннымі людзі?

Царскія слугі б’юць іх, страляюць

І сваіх брацціяў за сабак маюць.

А за што ж гэта? – ўсё за свабоду,

Што ў моры фальшу йшлі шукаць броду…

Сышліся цешыцца з царскага ўказу,

Што ўсім свабоду прыносіў адразу.

Кожны па-свойму судзіць стаў аб гэтым:

Ці ўказ праўдзівы, ці будзе прасветам

У нашым горы, у нашай няволі,

Ці ўжо кайданаў не ўзложаць ніколі?

Колас выкрывае антынародную сутнасць грамадска-палітычнага ладу царскай Расіі. Гэтаму, напрыклад, прысвечаны яго верш «Канстытуцыя», напісаны ў 1908 г.:

Канстытуцыю далі,

Адчынілі дзверы,

І… ў астрог нас павялі,

І таўкуць без меры…

Развялося стражнікоў,

Як якой жывёлы,

Ад іх плешак і шнуроў

Чырванеюць сёлы.

У творчасці Янкі Купалы пераважаюць грамадзянскія матывы – ідэалогія адраджэння беларускай культуры і беларускай нацыі, фарміравання ў простым народзе пачуцця культурнай роўнасці з іншымі народамі. Гэта складае ядро яго светапогляду.

Светапогляд Якуба Коласа, як і Янкі Купалы першапачаткова фармаваўся ў рэчышчы рэвалюцыйнага дэмакратызму, у якім дамінавала нацыянальнае пытанне. З аднаго боку, любоў да роднага краю, а з другога – сацыяльная і нацыянальная незадаволенасць беларусаў

існуючым становішчам, выклікалі ў Коласа сумна-экзістэнцыяльныя светапоглядныя ўстаноўкі [2, с. 543]. Гаворачы аб духоўных асаблівасцях беларуса, ён фіксаваў ўвагу на яго здольнасцях ды высокім душэўным стане. Апісваючы ж яго схільнасць да перманентнага пакаяння, нясмеласці і непрактычнасці, аўтар звяртае ўвагу на духоўныя, а не на матэрыяльна-практычныя арыентацыі.

Галоўнай заслугай грамадскай думкі пачатку XX ст., яе вынікам з’яўляецца пастаноўка пытання аб адраджэнні беларускай нацыянальнай культуры, аб праве беларускага народа на сваю дзяржаўнасць. Колас і Купала адлюстравалі ў сваёй творчасці рэвалюцыйны ўздым беларускага працоўнага народа, яго нянавісць да сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, імкненне «заняць пачэснае месца ў сям’і народаў» – «людзьмі звацца» [3, с. 91].

У дарэвалюцыйнай творчасці Купалы галоўнае месца займаюць праблемы, звязаныя з прызнаннем самога факту існавання беларускага народа, яго права на нацыянальнае самавызначэнне, самастойнае гістарычнае развіццё, уласную дзяржаўнасць. Многія яго творы напоўнены глыбокім сацыяльным зместам, накіраваны на выказванне і абарону інтарэсаў працоўнага народа, на абуджэнне ў ім рэвалюцыйнай актыўнасці [3, с. 107]. У гэтым дачыненні праграмным з’яўляецца верш «А хто там ідзе?»:

А хто там ідзе, а хто там ідзе

У агромністай такой грамадзе?

– Беларусы.

А што яны нясуць на худых плячах,

На руках ў крыві, на нагах у лапцях?

– Сваю крыўду.

А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,

А куды ж нясуць на паказ сваю?

– На свет цэлы…

На пытанне «А хто там ідзе?» аўтар даў цалкам пэўны і адназначны адказ – «беларусы». Менавіта ў гэтым слове сканцэнтравана нацыянальна-аб’яднальная ідэя.

Можна з упэўненасцю гаварыць і пра вечнае значэнне ранняй творчасці Янкі Купалы для фарміравання ўяўленняў беларусаў аб сабе як аб народзе. Паэзіі Купалы ўласцівы сімбіёз і перапляценне ўніверсальных катэгорый, нацыянальных і рэгіянальных эпітэтаў і ключавых слоў. Адносіны людзей да «волі», па думцы Купалы, маркіравала прыналежнасць да беларускага племені/народу. Ён з наўмысным выклікам, безапеляцыйна абвяшчаў «хто не любіць волі, не нашага роду» [3, с. 79], разумеючы, што, калі няма іншай магчымасці, варта хаця б паэтычным словам заклікаць народ да дзеяння, падштурхнуць яго да праявы актыўнай волі [2, с. 543].

Грамадска-палітычная сітуацыя 30-х гг. XX ст. не давала магчымасці пісьменнікам адкрыта выказваць свае думкі наконт права селяніна на зямлю і ўласную гаспадарку. Зямля, у разуменні Коласа, гэта не толькі матэрыяльны дастатак, яна арганізуе яшчэ і духоўны свет чалавека, раскрывае яго надзейнасць, сумленнасць, здольнасць умела і дбайна працаваць.

Падсумоўваючы сказанае, варта адзначыць: літаратурныя пошукі беларускіх пісьменнікаў характарызуюцца сувяззю з праблемамі часу і задачамі развіцця літаратуры. Найбольшае развіццё мастацка-філасофская думка атрымала ў тых выпадках, калі цесным чынам была звязана з надзённымі праблемамі быцця і чалавечай асобы. Дзейнасць Я. Коласа і Я. Купалы пачынае новы этап пошукаў нацыянальнай ідэі, асэнсоўваючы гістарычныя падзеі і месца чалавека ў іх. У творчасці Я. Коласа і Я. Купалы свабода і цэласнасць мастацка-філасофскага

светаўспрымання спалучылася, з аднаго боку, з рамантычнай традыцыяй, а з другога – з рацыяналістычнай думкай і аналітызмам. Іх творчасць – своеасаблівы вобраз свайго часу – пачатковага перыяду станаўлення беларускай нацыі, асабліва яе маладога пакалення, якое задумваецца над праблемай выбару.

**Спіс літаратуры:**


1. Ліс, А. С. Беларуская ідэя ў паэзіі Янкі Купалы / А. С. Ліс // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа ў сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя : матэрыялы Міжнар. навук. Канф., да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, Мінск, 25–26 верас. 2012 г. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: А. А. Манкевіч (уклад.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 129–136.

2. Вішнеўская, І. У. Ідэалогія нацыянальнай дзяржавы ў палітыка-прававой думцы першай чвэрці XX ст. / І. У. Вішнеўская // Науч. тр. Белорус. гос. экон. ун-та. – Минск : БГЭУ, 2010. – С. 540–546.

3. Гаранін, Л. Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. / Л. Я. Гаранін. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 176 с.